*З гісторыі прадпрыемстваў горада*

# Прадукцыя кобрынская – якасць еўрапейская

***Да 80- годдзя з часу заснавання***
***ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод»***

***Б і б л і я г р а ф і ч н ы   п а к а з а л ь н і к***

**Кобрын**
**2019**

ББК 91.9: 36.95(4Беи)
П 68

**Укладальнік:**

***С. Д. Курачук*** – галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

З 97 **Прадукцыя кобрынская - якасць еўрапейская** : бібліяграфічны паказальнік да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; уклад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2019. – 56 с.

ББК 91: 36.95(4Беи))

© Афармленне Кобрынская
цэнтральная раённая
бібліятэка, 2019

# ПРАДМОВА

Бібліяграфічны паказальнік «Прадукцыя кобрынская – якасць еўрапейская» выдадзены напярэдадні 80-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод».

За 80 гадоў існавання завод прайшоў вялікі шлях у сваім развіцці. Пачаў гісторыю ў далёкім 1939 годзе, перажыў знішчэнне ў перыяд нямецкай акупацыі і пасляваеннае адраджэнне літаральна «з нуля».

Сёння ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» - адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў малочнай прамысловасці рэспублікі па вытворчасці цвёрдых сычужных сыроў. Гэта горадаўтваральнае прадпрыемства па праву займае вядучыя пазіцыі ў малочнай галіне нашай краіны, мае велізарны патэнцыял канкурэнтаздольнасці, а таксама перспектывы да далейшага развіцця як на ўнутраным, так і на знешнім рынку. Спалучэнне якаснай сыравіны, сучаснага абсталявання сусветнага ўзроўню, а таксама найвышэйшага прафесіяналізму кобрынскіх майстроў дазваляе дасягнуць нязменнага прызнання сваёй якаснай, смачнай і карыснай прадукцыі ў спажыўцоў. Завод, які ў кастрычніку адзначыць 80 гадоў з моманту свайго заснавання, стаў візітнай карткай нашага горада.

Бібліяграфічны паказальнік мае наступную структуру:

- Прадмова;
- Гісторыка-эканамічны нарыс «Заўжды толькі лепшае. ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» 80 гадоў (1939 – 2019)» з раздзеламі:

➢ «*Знакавыя падзеі ў гісторыі завода*»

➢ «*Якасць і смак - на вышыні!*»

- «*Кобрынскія сыры: заўсёды толькі лепшае!*»
- «*Па працы і гонар*»;

- Спіс крыніц;
- Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне прадстаўляе каля 300 крыніц, уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1968 года. Творы друку згрупаваны па відах: кнігі, брашуры, главы, раздзелы з кніг, энцыклапедычныя артыкулы; часопісныя і газетныя артыкулы; найбольш стабільныя электронныя рэсурсы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні шырока прадстаўлены ілюстрацыйны матэрыял, фотаздымкі розных гадоў.

Выдадзены ў Год малой радзімы, паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, эканомікай, культурай.

# Заўжды толькі лепшае

**ААТ «Кобрынскі**
**масларобна-сыраробны завод»**

*80 гадоў (1939 – 2019)*




## Знакавыя падзеі ў гісторыі завода

Гісторыя Кобрынскага масларобна-сыраробнага завода бярэ пачатак у 1939 годзе. За гэты час прадпрыемства вырасла з маленькага маслазавода да вялікага масларобна-сыраробнага завода, прадукцыя якога годна канкурыруе на сучасных малочным і сырным рынках.

Датай нараджэння завода лічыцца кастрычнік 1939 года. Менавіта ўвосень 1939-га польскія ўлады рыхтаваліся ўрачыста адкрыць сучасную (па таму часу) сыраробную вытворчасць у

Кобрыне. Аднак па аб'ектыўных прычынах стужачку пры ўваходзе на новы завод давялося перараэзаць прадстаўнікам ужо новай улады — савецкай (*17 верасня савецкія войскі перайшлі польскую мяжу і праз некалькі дзён вызвалілі ўсю Заходнюю Беларусь у цэлым і Кобрын у прыватнасці*). Першае ў Кобрыне прадпрыемства па вырабу малочнай прадукцыі было арганізавана ў будынку, які належыў кавалерыйскім войскам царскай арміі і знаходзіўся побач з чыгуначным вакзалам па вуліцы Заслонава.

Не паспела прадпрыемства як след умацавацца, пачалася вайна. Нямецкія ўлады высока ацанілі якасць новага еўрапейскага сыраробнага абсталявання, усталяванага на кобрынскім заводзе, і яно было вывезена ў Германію.

Пасля вызвалення Кобрына ўлетку 1944 года на разбураным прадпрыемстве прыйшлося ствараць новы вытворчы цыкл. Пачаліся складаныя гады аднаўлення. Ужо праз некалькі месяцаў пасля вызвалення Беларусі завод пачаў выпрацоўваць у найцяжкіх вытворчых умовах сваю звычайную, але такую патрэбную для нашага народа прадукцыю: масла, тварог і нават сыр. У 1947 годзе завод тэхнічна пераўзброілі, што стала вялікай падзеяй для Кобрына. У пачатку 1950-х гадоў на прадпрыемстве працавала каля 30 чалавек, штодзень перапрацоўвалася зімой каля 300 л малака, летам – 20 т.



У. П. Башкіраў (першы дырэктар прадпрыемства), Е. П. Лукіна, А. Ф. Ноздрын, С. А. Камендант, А. С. Шыяненка, У. І. Мулярчык, А. М. Жырмант, В. С. Сляпухіна - гэтымі імёнамі пісалася гісторыя прадпрыемства. Усе яны з вялікай адказнасцю ставіліся да сваёй працы, гэтага ж патрабавалі і ад сваіх падначаленых. «Адпавядаць патрэбам часу» – такой устаноўцы прытрымліваўся кожны з кіраўнікоў завода.

З гэтай мэтай у 1967 годзе пабудавалі новы Кобрынскі масласырзавод (*дзе ў цяперашні час размяшчаецца прадпрыемства – вул. Савецкая, 128),* магутнасць якога была



разлічана на перапрацоўку 50 т малака за змену. Яна значна павялічылася, калі да прадпрыемства далучылі Драгічынскі масласырзавод, Дзівінскі і Антопальскі нізавыя заводы. У выніку мадэрнізацыі вытворчасці адбыўся пераход ад разліву малака ў флягі да выпуску яго ў поліэтыленавых пакетах, ад вагавага тварагу ў флягах да фасаванага ў пакетах. Было здадзена ў эксплуатацыю прыёмна-мыйнае аддзяленне, рэканструяваны кампрэсарны цэх, кацельня, цеплапункт, апаратны ўчастак.



Значнай вехай у гісторыі прадпрыемства стаў увод новых карпусоў завода ў 1968 годзе.

У 1984 годзе на заводзе пачаўся этап актыўнай рэканструкцыі і будаўніцтва.

Пасля запуску цэха сухога абястлушчанага малака ў 1990 годзе Кобрынскі масласырзавод выйшаў на першае месца ў Беларусі па перапрацоўцы абястлушчанага малака і падсырнай сыроваткі. Асвоена вытворчасць нізкатлустай прадукцыі (сыроў, кісламалочных напіткаў, нятлустага кефіру і тварагу, пладова-ягадных салодкіх і нятлустых сыркоў, чатырох відаў дэсертаў з выкарыстаннем альбумінавага тварагу), прадукцыі з немалочнай сыравіны (маянэзу, гарчыцы, соусаў). Выраблялася таксама шакаладнае масла, некалькі відаў марожанага, сыроватка для сіласавання кармоў. Распрацавана тэхналогія малочна-бялковых дэсертаў з рознымі напаўняльнікамі. З цягам часу было вырашана нарасціць выпуск сырнай прадукцыі, з гэтай мэтай зрабілі рэканструкцыю ў сырцэху, мадэрнізавалі абсталяванне.

У 1997 годзе завод набыў статус акцыянернага таварыства адкрытага тыпу.

У 1998 годзе здадзены ў эксплуатацыю адміністрацыйна-бытавы корпус, пральня, тарны цэх, у 1999 – 48-кватэрны жылы дом для работнікаў прадпрыемства. Заключаны дагавор з Брэсцкім цэнтрам стандартызацыі і метралогіі аб распрацоўцы сістэмы якасці па міжнародных стандартах серыі ІСО-9000 (1999 год).

З 2008 года на пасадзе дырэктара – М. С. Місюк. Сам



добры дэгустатар, ён хутка засвоіў вытворчасць і павялічыў паказчыкі відаў сыроў амаль у тры разы. Шматлікія ўзнагароды кіраўніка, сярод якіх медаль «За працоўныя заслугі», дыплом лаўрэата

рэспубліканскага конкурсу «Чалавек справы – 2014» у намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі» ў сферы харчовай прамысловасці (*падобны трафей у перапрацоўчай галіне атрымліваюць толькі самыя паспяховыя кіраўнікі айчынных і замежных прадпрыемстваў, якія найбольш дынамічна развіваюцца ў рэаліях беларускага рынку*), удзячнасць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, актыўную грамадскую дзейнасць – сведчанне таго, што прадпрыемства развіваецца ў правільным накірунку.




У перыяд з 2012 – 2013 гадоў заводам набыта абсталяванне для вырабу плаўленых сыроў, новая лінія па ўпакоўцы сыру, абсталяванне па вытворчасці твары. На заводзе вядзецца пастаянная мэтанакіраваная работа па ўкараненні ў вытворчасць новай інавацыйнай упакоўкі.

У верасні 2013 года на МСЗ пачаўся «новы адлік» - будаўніцтва сучаснага цэха па вытворчасці сыру, а ў жніўні 2015 года быў запушчаны новы цэх па вытворчасці цвёрдых і паўцвёрдых сыроў, у тым ліку элітнай групы, які быў абсталяваны самым сучасным аўстрыйскім абсталяваннем «BERTSCH - Laska». Увесь працэс вытворчасці сыра сення ажыццяўляецца на новым імпартным абсталяванні такіх фірмаў, як «Berch», «GEA», «KALT», якое



дазваляе не толькі павялічыць якасць прадукцыі, але і працаваць у рэжыме эканоміі электраэнергіі, што немалаважна ў наш час. Пры выбары абсталявання перш за ўсё кіраваліся тым, каб захаваць існуючыя тэхналогіі, традыцыі і высокую якасць. Пры гэтым ставілася мэта замяніць ручную працу на аўтаматызаваную, каб



завод сапраўды быў еўрапейскага ўзроўню. Магутнасці новага цэха дазвалялі выпускаць да 30 тон сыроў у суткі, вырабляць сыры рознай формы, прычым у аўтаматызаваным рэжыме, а таксама сыры дробнай фасоўкі.

Дзякуючы агульнай і мэтанакіраванай працы ўсяго калектыву прадпрыемства практычна заўсёды знаходзіцца ў лідэрах галіны не толькі ў Брэсцкай вобласці, але і ў краіне. За сваю плённую працу многія работнікі ў розныя гады былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод. Сярод іх:

Захарэвіч Валянціна Пятроўна, узнагароджаная ордэнам Леніна,

Пішчык Соф'я Мікалаеўна і Пуставіт Іван Лікандравіч, узнагароджаныя ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга,

Салівончык Ніна Аляксандраўна, удастоеная ордэнаў Славы II і III ступені,

Васілюк Валянціна Валянцінаўна, узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём «За працоўную адзнаку».

Многія працаўнікі прадпрыемства былі ўзнагароджаны ўрадавымі медалямі і Ганаровымі граматамі, а таксама медалямі ВДНГ.

З 2015 года на пасадзе дырэктара – Руслан Іванавіч Чыбатар. Малады кіраўнік працягвае традыцыі сваіх



папярэднікаў. У 2017 годзе дырэктар Кобрынскага масларобна-сыраробнага завода Руслан Чыбатар прызнаны адным з лепшых кіраўнікоў сельскагаспадарчых і перапрацоўчых прадпрыемстваў.

## Якасць і смак – на вышыні!

Пацвярджэннем высокай гарантыі стабільнай якасці прадукцыі завода з'яўляецца работа ў сістэме менеджменту якасці па міжнародных стандартах ІСО 9001-2001. Высокая культура вытворчасці, укараненне высокатэхналагічнага абсталявання, сучасных сістэм менеджменту дазваляюць выпускаць якасную і бяспечную прадукцыю, якая адпавядае ўсё ўзрастаючым запытам спажыўцоў.

На ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» уся прадукцыя выпрабляецца з натуральнага высакаякаснага адборнага малака, у сувязі з гэтым старанна аналізуецца якасць сыравіны, якая паступае на прадпрыемства. З мэтай кантролю якасці для кожнай гаспадаркі закуплена лабараторнае абсталяванне, створаны адмысловы транспартны ўчастак.

Завод цесна супрацоўнічае з аграрным сектарам раёна, аказваючы пастаянную падтрымку сельгаспрадпрыемствам. Адной з найважных задач у айчыннай малочнай прадукцыі з'яўляецца забеспячэнне гаспадарак халадзільным абсталяваннем. Прадпрыемства забяспечвае пастаўшчыкоў мыйнымі і

дэзінфекцыйнымі сродкамі, дробным інвентаром, транспартам, ёмістасцямі для збору малака. Тут цэняць сваіх пастаўшчыкоў і заўсёды ідуць ім насустрач.

На заводзе наладжана безадходная перапрацоўка малака, прымяняюцца рэсурсазберагальныя тэхналогіі.

Пастаянна вядзецца работа па абнаўленні і пашырэнні асартыменту выпускаемай прадукцыі. ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» перапрацоўвае 240 тон малака ў суткі і выпускае больш за 150 найменняў прадукцыі – ад масла, тварагу, гарчыцы да пудынгаў і напіткаў.

Асноўныя з іх:
•сыры цвёрдыя сычужныя,
•масла,
• мяккія сыры,
• плаўленыя сыры,
• марожанае,
• дэсерты, пудынгі,
• маянэзы,
• соусы таматавыя,
• гарчыца,
• сухія малочныя прадукты:
малако сухое, абястлушчанае;
малочны цукар-сырэц;
сыроватка малочная сухая.












У 2017 годзе ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» выпусціў марожанае «Цёплае» ў вафельным кубачку. Упакоўка з новай смакатой упрыгожаная мульцяшнымі шарыкамі марожанага з надпісам «Мамы, не хвалюйцеся!» Гэта азначае, што прысмакамі можна частавацца нават тым дзецям, у якіх часта баліць горла. Марожанае доўга не растае пры пакаёвай тэмпературы, а па кансістэнцыі нагадвае зефір.







Павышанай папулярнасцю карыстаецца марожанае «Пламбір ванільны» ў вафельным стаканчыку, якое створана паводле рэцэптур 1962 года.

Наогул, уся прадукцыя ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» якасная і смачная. Пацвярджэннем таму служыць тое, што прадукцыя прадпрыемства на складзе не затрымліваецца.





















Прадукцыю Кобрынскага масларобна-сыраробнага завода ведаюць не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Партнёрамі прадпрыемства з'яўляюцца больш за 600 арганізацый з усіх рэгіёнаў рэспублікі.

Завод з’яўляецца экспартна арыентаваным: 90 працэнтаў прадукцыі ідзе на экспарт. Аснова экспарту – сыры. З 2005 па 2016 год прадпрыемства павялічыла паказчык экспарту ў аб'ёме прамысловай вытворчасці практычна ў два разы – з 49,6% да 83,9%. Аднак і сёння завод увесь час адстойвае сваё права канкурыраваць з прадпрыемствамі, якія вырабляюць малочную прадукцыю як у Рэспубліцы Беларусь, так і за яе межамі.

ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» працуе на міжнародным рынку з краінамі бліжняга замежжа. Тавары адпраўляюцца ў Расію, Казахстан, Туркменістан, Узбекістан, Украіну.

Паміж ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» і шэрагам еўрапейскіх вытворцаў наладжана цеснае дзелавое супрацоўніцтва. Спецыялісты абменьваюцца вопытам, ведамі, арганізоўваюць сумесныя практычныя семінары і курсы павышэння кваліфікацыі.

Завод ідзе па шляху мадэрнізацыі. На прадпрыемстве рэалізаваны маштабны інвестыцыйны праект.



# Кобрынскія сыры: заўсёды толькі лепшае!

Сёння ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» - адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў малочнай прамысловасці рэспублікі па вытворчасці цвёрдых сычужных сыроў. Можна сказаць, што сыраробства – фірменны знак, сімвал завода.

Сыраробства з’яўляецца асноўным накірункам вытворчасці: на гэтыя мэты ідзе больш за 70% сыравіны. Каля 90% гатовага сыру адпраўляецца на экспарт. Пад маркай «Кобрынскія сыры», якая стала брэндавай, выпускаюць 31 від паўцвёрдых сыроў, з якіх 28 – па ўласных распрацоўках. Кожны – са сваім смакам і водарам.

У апошні час кобрынскія сыраробы пачалі вырабляць элітныя сыры з доўгім тэрмінам выспявання, ад 6 месяцаў да года, і дабіліся значных поспехаў.

Сярод цікавых распрацовак – сыр паўцвёрды «Леанарда» 50% з водарам вяршкоў, сыр паўцвёрды «Бургамістр» 50% з



водарам топленага малака, сыр паўцвёрды «Монблан» 50%, адметнай асаблівасцю якога з'яўляецца ўпакоўка ў латэкснае пакрыццё з нанясеннем сульфітнай этыкеткі. Адпрацавана тэхналогія і асвоена



вытворчасць цвёрдых сыроў з працяглым тэрмінам паспявання: сыр «Пармскі» CoLd (180 сутак), Crand (120 сутак), deLuxe (90 сутак). Для гэтых сыроў характэрныя насычаны

сырны, рэзка-саладкаваты смак і шчыльная, злёгку ломкая кансістэнцыя.

Кобрынскія сыры лічацца лепшымі ў рэспубліцы. Пацвярджэннем таму служыць іх высокі кошт за мяжой. Павышанай папулярнасцю карыстаюцца сыры «Эдэльвейс эліт», «Вялікі Карл», «Рыцар» і інш.




Так спалучэнне сучасных сусветных тэхналогій, лепшых традыцый сыраробства, якаснай сыравіны і найвышэйшага прафесіяналізму кобрынскіх сыраробаў нараджае сапраўды непаўторны смак, вяртацца да якога хочацца зноў і зноў, а таксама дазваляе пацвердзіць прафесійнае крэда завода: «*Кобрынскія сыры: заўсёды толькі лепшае!*».



# Па працы і гонар

Прадпрыемства ўдзельнічае ў шматлікіх выстаўках і ярмарках, праводзіць маркетынгавыя даследаванні па вывучэнні мясцовага рынку і замежнага. Прызнаннем высокаякаснай прадукцыі завода служаць і перамогі ў розных конкурсах. Дарэчы, прадукцыя Кобрынскага масларобна-сыраробнага завода ўжо некалькі гадоў запар атрымлівае толькі вышэйшыя ўзнагароды.



Сыр «Пармскі», тэхналогію вытворчасці якога тут асвоілі першымі ў рэспубліцы, атрымаў Гран-пры на прэстыжнай выстаўцы «Малочная і мясная індустрыя» і залаты медаль на выстаўцы «Прадэкспа-2013».



У 2014 годзе паўцвёрдыя сыры «Вялікі манарх» і «Эдэльвейс», цвёрды сыр «Пармскі Gold» былі ўдастоены залатога медаля на Міжнароднай выставе «Продэкспа-2014» у Маскве. Аналагічную ўзнагароду кабрынчане атрымалі на маскоўскім конкурсе «Малочны поспех» за сухую сыроватку, а таксама гран-пры за цвёрды сыр «Чорны граф» і тварог «Пяшчотны».







У 2015 годзе паўцвёрды сыр «Успенскі» стаў лаўрэатам конкурсу

«Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», цвёрды сыр «Пармскі Gold» на XXII Міжнароднай выстаўцы харчовых тавараў «Прадэкспа-2015» у Маскве заваяваў «золата» ў намінацыі «Сыры».

ААТ «Кобрынскі МСЗ» заваяваў Гран-пры на конкурсе «Лепшая прадукцыя года – 2016», які праводзіўся па ініцыятыве Беларускага таварыства абароны спажыўцоў пры падтрымцы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі па харчаванні, за стабільную якасць прадукцыі. Дыпломамі былі адзначаны:




у намінацыі «Сыры сычужныя» сыры «Маасдам» і «Гауда», яркія прадстаўнікі еўрапейскай калекцыі сыроў;




у намінацыі «Тварожная прадукцыя» тварог 9% пад гандлёвай маркай «Удалы выбар»;

у намінацыі «Марожанае» эскімо «Ленінградскае» пад гандлёвай маркай «Брынка-Айс».






У 2017 годзе ААТ «Кобрынскі МСЗ» заваяваў залатыя медалі на конкурсе «Лепшы прадукт – 2017», які праводзіўся Міністэрствам сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі на міжнароднай выставе «Прадэкспа» ў Маскве, за сыр «Монблан» 50% і сыр «Маасдам» 45%. Акрамя таго, сыр «Монблан» 50% быў удастоены Дыплома I ступені на міжнародным конкурсе-

дэгустацыі, які праходзіў у рамках выставы. У рамках форуму дырэктар прадпрыемства Р. Чыбатар атрымаў Дыплом лаўрэата конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» у намінацыі «Харчовыя тавары» за сыры «Гауда» 45%, «Маасдам» 45% і тварог 9%. Заводам таксама быў атрыманы Дыплом за дасягненне высокіх вынікаў у выпуску прадукцыі стабільнай якасці. Прадпрыемства было ўдастоена Дыплома ўдзельніка Прэміі Брэсцкага аблвыканкама за дасягненні ў галіне якасці.

ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» адзначаны дыпломамі пераможцаў грамадскага конкурсу «Лепшая прадукцыя года - 2018» у намінацыі:




масла сметанковае – масла сметанковае «Сталічнае» 72,5%.

марожанае – эскімо сметанковае з водарам ванілі ў глазуры «Ленінградскае класічнае»

сыры сычужныя - сыр «Абацкі» 50%, сыр «Монблан Снежная вяршыня» 50%.

У 2019 годзе ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» стаў лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», удастоены ўзнагарод міжнароднай выставы «Прадэкспа -2019».









І яшчэ адна перамога бягучага года. ААТ «Кобрынскі МСЗ» узяў Гран-пры за сыры «Монблан Снежная вяршыня» і «Арамель» на штогадовым Міжнародным малочным бізнэс-форуме ЕАЭС па вытворчасці і перапрацоўцы малака, які прайшоў 10 – 12 верасня ў Сочы. Заслужаная ўзнагарода за традыцыйна высокую якасць!




Магутны і велічны, першы ў рэспубліцы сярод падобных прадпрыемстваў па эканамічных паказчыках – такім мы бачым завод сёння. За высокімі паказчыкамі – восем дзесяцігоддзяў напружанай працы.



Смачныя тавары прадпрыемства вядомы далёка за межамі Беларусі. На заводзе з цягам часу атрымаўся гарманічны сімбіёз лепшых традыцый мінулага і прагрэсіўных сучасных падыходаў. Прадпрыемства працуе рэнтабельна, прыбыткова, і ў

гэтым заслуга кожнага работніка, лепшай пахвалой якому з'яўляецца агульнапрызнаная якасная прадукцыя.

Палітыка прадпрыемства:




- максімальнае задавальненне запытаў спажыўцоў;
- захаванне прэстыжу прадпрыемства на асвоеных рынках збыту і стварэнне іміджу на новых рынках;
- забеспячэнне якасці прадукцыі шляхам прымянення перадавых тэхналогій і сучасных метадаў кіравання вытворчасцю.

# СПІС КРЫНІЦ


**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Кобрынскі масласыраробчы завод» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 412-413.

**Кобринские** сыры. Всегда только лучшее! // Брестчина, устремленная в будущее : фотоальбом. – Брест, 2009. - С. 274-275.

**Кобринский** маслодельно-сыродельный завод // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск.- 2007. - Т. 4. - С. 100.

**Кобринский** маслосырзавод // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : [в 5 т.]. - Минск, 1979. - Т. 2. - С. 285.

**Кобрынскі** масласырзавод // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : [у 5 т.]. - Мінск, 1979. - Т. 2. - С. 348.

**Корбут, В**. ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод» 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. - Минск : Друк-С., 2010. - 184 с.

**Открытое** акционерное общество «ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». Всегда только лучшее! : рекламное издание. – Кобрин, 2014. – 10 с.

**Открытое** акционерное общество «ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод» // Инвестиционные возможности Брестской области. Кобринский район. – Брест, 2004. – С. 21.

**Сітуха, У.** Калі сыр плача – майстар смяецца / Уладзімір Сітуха // Стваральнікі : у 2 ч. / Уладзімір Сітуха. – Брэст, 2013. – Ч. 1. - С. 152-158.

**80 гадоў** з часу заснавання ААТ « Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 113-114 .

**Белов, Д.** «Кобринские сыры — лучшие на «ПРОДЭКСПО-2019» / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. - 27 лютага. - С. 2.

**Бухгалтерский** баланс за январь-декабрь 2018 года ОАО «Кобринский МСЗ» // Заря. - 2019. — 20 апреля. — С. 23.

**Вошел** в десятку лучших // Кобрынскі веснік. - 2019. - 16 студзеня. - С. 2.

Кобринский маслодельно-сыродельный завод стал лауреатом конкурса «Лучшие товары Республики Беларусь».

**Елизарова, Ж.** Качество сегодня — гарантия успеха завтра / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. - 20 красавіка. - С. 1, 3.

Стратегия ОАО «Кобринский МСЗ» — завоевать обширный потребительский рынок качеством и вкусом.

**Мельнік, Р**. У фармаце жывога дыялогу / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2019. – 14 верасня. – С. 2.

Старшыня Белтэлерадыекампаніі І. Эйсмант высока ацаніў дасягненні калектыву Кобрынскага МСЗ.

**О престижности** конкурсов в области качества // Заря. - 2019. - 27 апреля. - С. 20.

ОАО «Кобринский МСЗ» получил заслуженные награды по итогам областного конкурса за достижения в области качества.

**Сергеев, И.** Диплом за сыр / Иван Сергеев // Заря. - 2019. - 4 мая. - С. 9.

Кобринский маслодельно-сыродельный завод удостоен наград международной выставки «Продэкспо-2019».

**Сергеев, И.** Чей товар лучше? / Иван Сергеев // Заря. - 2019. - 9 января. - С. 3.

Кобринский МСЗ — среди победителей конкурса «Лучшие товары Республики Беларусь» за 2018 год.

**Белов, Д**. Новые победы наших сыроделов / Дмитрий Белов // Заря. - 2018. - 19 июня. - С. 2.

**Белов, Д.** Кобринские сыроделы подтвердили высокое качество / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2018. - 23 мая. - С. 3.

ОАО «Кобринский МСЗ» подтвердил звание лауреата Премии Правительства Республики Беларусь за 2017 год.

**Волков, С.** Чьи сыры лучше? / Сергей Волков // Заря. - 2018. - 29 сентября. - С. 2.

Кобринские сыроделы взяли Гран-при профессионального конкурса в Сочи.

**Волков, С.** Чья «молочка» вкуснее? / Сергей Волков // Заря. - 2018. - 19 июня. - С. 2.

Продукция Кобринского маслодельно-сыродельного завода удостоена наград конкурса-дегустации «Чемпион вкуса».

**Высокое** качество и отменный вкус // Кобрынскі веснік. - 2018. - 29 верасня. - С. 9.

Кобринские сыроделы подтвердили высокое качество своей продукции.

**Елизарова, Ж**. Искусство быть лидером / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. - 17 лістапада. - С. 3.

Кобринские сыры дегустировали на Международной выставке в Китае.

**Елизарова, Ж.** Новые горизонты кобринских сыроделов / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. - 17 лютага. - С. 3.

Сыроделие — основное направление работы ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод».

**Елизарова, Ж.** ОАО «Кобринский МСЗ»: «Всегда только лучшее!» / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. - 14 ліпеня. - С. 3.

**Курец, А.** Названы лучшие руководители в сфере АПК / Александр Курец // Сельская газета. - 2018. - 14 июля. - С. 26.

Руководитель Кобринского маслодельно-сыродельного завода — среди победителей областного конкурса.

**ОАО** «Кобринский маслодельно-сыродельный завод» поздравляет с праздником Пасхи! // Комсомольская правда. - 2018. - 6 апреля. - С. 8.

Продукция ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод» — различные сорта сыра, молоко, масло и творог.

**Сергеев, И.** Медаль за сыр / Иван Сергеев // Заря. - 2018. -17 февраля. - С. 2.

Продукция Кобринского МСЗ удостоена высоких наград на конкурсе «Лучший Продукт - 2018» в Москве.

**Тоболич, С**. Кто лучший руководитель / Светлана Тоболич // Заря. - 2018. - 14 июля. - С. 2.

Среди победителей областного конкурса — руководитель Кобринского маслодельно-сыродельного завода.

**Яскевіч, С.** Кобрынскія сыры: напоўненыя смакам і любоўю / Святлана Яскевіч, Алена Даўжанюк // Звязда. - 2018. - 22 снежня. - С. 6.

**Апрелев, В.** Лучшие руководители: кто они? / Владимир Апрелев // Заря. - 2017. - 29 июля. - С. 6.

Директор ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод» Р. Чиботарь признан одним из лучших руководителей сельскохозяйственных и перерабатывающих предприятий.

**Белов, Д.** «Кобринские сыры» : всегда только лучшее! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2017. - 24 мая. – С. 3.

Сочетание качественного сырья, современного оборудования мирового уровня, а также высочайшего профессионализма кобринских сыроделов позволяет подтвердить профессиональное кредо завода: «Кобринские сыры: всегда только лучшее!».

**Волков, С.** Теплое ... мороженое / Сергей Волков // Заря. - 2017. - 27 июня. - С. 2.

Фирменный ассортимент Кобринского МСЗ пополнился сливочным ванильным мороженым под маркой «Тёплое».

**Всегда** только лучшее! // Вечерний Брест. - 2017. - 17 ноября. - С. 5.

Под таким девизом работает и успешно развивается коллектив Кобринского маслодельно-сыродельного завода.

**Елизарова, Ж.** Гарантия высокого качества / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2017. - 18 лістапада. - С. 2.

Кобринские сыры широко известны не только на отечественном, но и на зарубежном рынке.

**Курец, А.** Лучших руководителей АПК области определили в «Беловежском» / Александр Курец // Сельская газета. - 2017. - 8 июля. - С. 22.

По итогам прошлого года директор ОАО «Кобринский МСЗ» Р. Чиботарь признан одним из лучших руководителей сельскохозяйственных и перерабатывающих предприятий.

**Любопытно** // 7 дней. - 2017. — 6 июля. — С. 4.

Кобринский МСЗ начал выпускать «теплое» мороженое.

**Трибулева, Е**. Скажите «сы-ы-ыр!» / Елена Трибулева // Вечерний Брест. - 2017. - 27 января. - С. 6.

В Бресте открыт фирменный павильон от ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод».

**Хокимова, А**. Брестская колбаса и высоковские сыры на «Продэкспо» / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. - 2017. — 8 февраля. — С. 3.

ОАО «Кобринский МСЗ» представит свою продукцию на международной выставке продуктов питания «Продэкспо».

**Юшкевич, П.** Три составляющие успеха / Павел Юшкевич // Сельская газета. - 2017. - 16 ноября. - С. 15.

Традиционный способ производства, самое современное оборудование, качественное сырье — три составляющие успеха ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод».

**Яскевіч, С.** Цеплае ... марозіва / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2017. - 29 чэрвеня. - С. 16.

Кобрынскі масларобна-сыраробны завод выпусціў марозіва «Цеплае» ў вафельным кубачку.

**Всегда** только лучшее! // Кобрин-информ. - 2016. - 28 июля. - С. 2.

Только качественные продукты в магазине «Верас» (ул. Николаева, 1а) ОАО «Кобринский МСЗ».

**Дубіна, Л.** Са знакам якасці / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. - 16 ліпеня. - С. 3.

Прадукцыя ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» карыстаецца вялікім попытам.

**Дубина, Л.** Чемпионы вкуса / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 19 лістапада. - С. 10.

ОАО «Кобринский МСЗ» завоевал Кубок чемпионов в народном конкурсе-дегустации «Чемпион вкуса».

**Ефтифеева, Н.** Кобринские сыры - лучшие / Наталья Ефтифеева // Кобрынскі веснік. - 2016. - 15 чэрвеня. - С. 2.

Продукция Кобринского МСЗ пользуется популярностью как в Беларуси, так и за пределами нашей страны.

**Ефтифеева, Н.** Сырный Гран-при / Наталья Ефтифеева // Кобрынскі веснік. - 2016. - 18 чэрвеня. - С. 3.

На XXVI Международной специализированной выставке «Белагро-2016» продукция Кобринского МСЗ завоевала высшие награды.

**Зинкевич, Т.** Фестиваль мороженого в помощь хоспису / Т. Зинкевич // Кобрин-информ. - 2016. - 22 сентября. - С. 3.

Кобринский МСЗ принимал участие в республиканском благотворительном фестивале мороженого.

**Кобринские** сыры // Заря. - 2016. - 19 ноября. - С. 8.

Более 150 наименований молочной продукции выпускают на Кобринском маслодельно-сыродельном заводе.

**Курбат, Л.** «Першыя скрыпкі» АПК / Лідзія Курбат // Народная трыбуна. - 2016. - 19 жніўня. - С. 4.

Кіраўнік ААТ «Кобрынскі МСЗ» Р. Чыбатар стаў пераможцам абласнога конкурсу сярод кіраўнікоў перапрацоўчых прадпрыемстваў.

**Курец, А.** Кефир до Питера доведет / Александр Курец // Советская Белоруссия : Союз. Беларусь-Россия. - 2016. - 25 августа. - С. III.

Кобринский маслосыродельный завод представит свою продукцию на Днях Бреста в Санкт-Петербурге.

**МСЗ** - лідар галіны // Кобрынскі веснік. - 2016. - 28 верасня. - С. 2.

ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» увайшло ў ТОП-25 прадпрыемстваў-лідараў Рэспублікі Беларуь, заняўшы 8 месца ў бізнес-рэйтынгу.

**Ярмошук, Н**. Кто лучший руководитель? / Николай Ярмошук // Заря. - 2016. - 2 августа. - С. 1.

Руководитель ОАО «Кобринский МСЗ» занял второе место в областном конкурсе «Лучший руководитель перерабатывающего предприятия ГО «Управляющая компания холдинга «Концерн Брестмясомолпром» за 2015 год.

**Дубіна, Л.** Новыя перспектывы для развіцця / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. - 14 студзеня. - С. 2,5.

З гісторыі масларобна-сыраробнага завода, прадукцыю якога ведаюць не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі.

**Нижник, Н.** Гран-при за качество / Наталья Нижник // Кобрынскі веснік. - 2015. - 26 снежня. - С. 3.

Продукция Кобринского МСЗ получила гран-при на конкурсе «Лучшая продукция года – 2015».

**Нижник, Н. «**Новый отсчет» кобринских сыров / Наталья Нижник // Кобрынскі веснік. – 2015. – 26 верасня. – С. 9.

Кобринский МСЗ пополнился новым современным цехом по производству сыра.

**Партнёр** фестывалю. Генеральны // Народная трыбуна. - 2015. - 28 чэрвеня. - С. 3.

ААТ «Кобрынскі масларобчы-сыраробчы завод» выступіў генеральным партнёрам сырнага фестывалю.

**Самые** эффективные по версии облагропромсоюза // Вечерний Брест. - 2015. - 8 июля. - С. 3.

Среди победителей сельскохозяйственных и перерабатывающих предприятий области по экономической эффективности - ОАО «Кобринский МСЗ».

**ТОП-100** акционерных обществ 2014 // Экономическая газета. - 2015. - 2 июня. - С. 13.

Среди АО - Кобринский маслосырзавод (сведения о прибыли, выручке, среднесписочной численности, уставном фонде).

**Фестиваль** в жёлтом цвете // Вечерний Брест. - 2015. - 24 июня. - С. 3.

Кобринский маслодельно-сыродельный завод выступил генеральным партнёром XI сырного фестиваля в Минске.

**Чабатар, Р**. Галоўнае – якасць / [Руслан Чабатар; запісала] Н. Ніжнік // Кобрынскі веснік. – 2015. – 18 ліпеня. – С. 4.

Р. Чабатар, дырэктар масларобна-сыраробнага завода, – аб дасягненнях і перспектывах прадпрыемства.

**Вкусные** летние удовольствия // Кобрин-информ. - 2014. - 27 марта. - С. 3.

Кобринский МСЗ открывает сезон продажи мороженого.

**Дубіна, Л.** Гонар нашага горада - Кобрынскі МСЗ / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2014. - 25 кастрычніка. - С. 2.

Семдзесят пяць гадоў мінула з дня ўтварэння МСЗ.

**Ефимов, В.** Четыре аиста с сыром в клювах / Владимир Ефимов ; фото автора // Брестский вестник. – 2014. - 19 июня. – С. 4.

Четыре крупных производителя сыров Брестчины, в том числе Кобринский маслодельный-сыродельный завод, представили свою продукцию на II республиканском фестивале сыра.

**Кобринские** сыры удостоены дипломов // Кобрин - информ. - 2014. - 18 декабря. - С. 2.

ОАО «Кобринский МСЗ» - финалист премии «Народная марка» в номинации «Производитель сыров твердых сыров».

**Кулецкі, У.** Добры кіраўнік: сямейны і адказны / Уладзіслаў Кулецкі // Звязда. - 2014. - 11 ліпеня. - С. 2.

М. Місюк, дырэктар ААТ «Кобрынскі МСЗ» - пераможца ў конкурсе «Чалавек справы».

**Мельнік, Р**. «Якасць, правераная дзесяцігоддзямі» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2014. - 19 ліпеня. - С.10.

Дырэктар ААТ «Кобрынскі МСЗ» М. Місюк стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Чалавек справы».

**Пашкович, Л.** И в Москве оценили / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2014. - 2 красавіка. - С. 1.

На международной выставке в Москве маслодельно-сыродельный завод получил очередные награды.

**Сезон** новых вирусов // Советская Белоруссия. - 2014.- 17 апреля. - С. 10.

В республиканском конкурсе «Чемпион вкуса» ОАО «Кобринский МСЗ» оказался на II месте.

**«Золотой** густ» для наших // Заря. - 2013. -10 декабря. – С. 2.

Обладателем диплома «Золотой ГУСТ» среди 15 предприятий области стал и Кобринский МСЗ.

**Золотые** медали за высокое качество сыров // Кобрынскі веснік. - 2013. - 23 лютага. - С. 1.

Кобринский МСЗ отмечен найвысшими наградами на Международной выставке в Москве.

**И опять** кобринские сыры - лучшие! : знай наших! // Кобрынскі веснік. - 2013. - 23 сакавіка. - С. 1.

На XI международной выставке «Молочная и мясная индустрия», которая прошла в Москве, золотые медали и гран-при завоевали сыры нашего завода.

**Измоденова, Л.** Мы едим, чтобы жить / Людмила Измоденова // Кобрин-информ. - 2013. - 18 апреля. - С. 26.

О полезной продукции предприятий города.

**Козлова, Т.** Что будете заказывать? : каких новинок стоит ждать любителям сыров / Татьяна Козлова // Рэспубліка. - 2013. - 27 сакавіка. - С. 22.

ОАО «Кобринский МСЗ» стал лауреатом правительственной премии за достижения в области качества за 2012 год.

**О вкусе** кобринских сыров позаботилась сама природа! // Комсомольская правда. - 2013.- 25 октября. - С. 10.

На Кобринском МСЗ вся продукция изготавливается из натурального высококачественного молока.

**Обладатели** диплома «Золотой ГУСТ» // Кобрин-информ. - 2013. - 12 декабря. - С.3.

Кобринский МСЗ вошел в число обладателей диплома «Золотой ГУСТ» - за стабильно высокое качество, внедрение новых технологий и широкий ассортимент выпускаемой продукции.

